УДК [929.651+94](476)«1918/1919»

# ГОСУДАРСТВЕННО-ПОЛИТИЧЕСКАЯ СИМВОЛИКА НА ПЕЧАТЯХ ДОКУМЕНТОВ 1918–1919 гг. (ПО МАТЕРИАЛАМ ФОНДА 805 НАЦИОНАЛЬНОГО АРХИВА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ)

***А. А. ЛУКАШОВ***[1)]

[1)]*Барановичский государственный университет, ул. Войкова, 21, 225404, г. Барановичи, Брестская обл., Беларусь*

Революционные события 1918–1919 гг. на территории Беларуси, процесс создания белорусской государственности в новейшей истории требуют комплексного, в том числе сфрагистического, исследования. В частности, актуальной проблемой является формирование советской символики в этот период. Разработка символов первых в мире социалистических государств нашла свое отражение на печатях, которые создавались и использовались в этот период. Анализ содержания оттисков печатей, хранящихся в фонде 805 Национального архива Республики Беларусь, позволил выявить факт применения местными властями печатей с символикой государственных образований, которые к моменту подписания документа исчезли и признавались идеологически враждебными коммунистам.

***Ключевые слова:*** сфрагистика; события 1918–1919 гг. в Беларуси; документы Национального архива Республики Беларусь; источники по истории Беларуси; государственно-политическая символика 1918–1919 гг.

**Образец цитирования:**
Лукашоў АА. Дзяржаўна-палітычная сімволіка на пячатках дакументаў 1918–1919 гг. (па матэрыялах фонду 805 Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь). *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя*. 2021;2:91–97.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2021-2-91-97

**For citation:**
Lukashov AA. State and political symbols on the seals of documents of 1918–1919 (based on materials from fund 805 of the National Archives of the Republic of Belarus). *Journal of the Belarusian State University. History.* 2021;2:91–97. Belarusian.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2021-2-91-97

**Автор:**
***Андрей Алексеевич Лукашов*** – кандидат исторических наук; старший преподаватель кафедры педагогики и социально-гуманитарных дисциплин факультета педагогики и психологии.

**Author:**
***Andrei A. Lukashov***, PhD (history); senior lecturer at the department of pedagogy and social and humanitarian disciplines, faculty of pedagogy and psychology.
*lukashov@tut.by*

CC BY NC

Журнал Белорусского государственного университета. История. 2021;2:91–97
Journal of the Belarusian State University. History. 2021;2:91–97

# ДЗЯРЖАЎНА-ПАЛІТЫЧНАЯ СІМВОЛІКА НА ПЯЧАТКАХ ДАКУМЕНТАЎ 1918–1919 гг. (ПА МАТЭРЫЯЛАХ ФОНДУ 805 НАЦЫЯНАЛЬНАГА АРХІВА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ)

***А. А. ЛУКАШОЎ*** [1*]

[1*] *Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт, вул. Войкава, 21, 225404, г. Баранавічы, Брэсцкая вобл., Беларусь*

Рэвалюцыйныя падзеі 1918–1919 гг. на тэрыторыі Беларусі, працэс стварэння беларускай дзяржаўнасці ў навейшай гісторыі патрабуюць усебаковага, у тым ліку сфрагістычнага, даследавання. У прыватнасці, актуальным пытаннем з'яўляецца фарміраванне савецкай сімволікі ў дадзены перыяд. Распрацоўка сімвалаў першых у свеце сацыялістычных дзяржаў знайшла сваё адлюстраванне на пячатках, якія ствараліся і выкарыстоўваліся ў гэты перыяд. Аналіз зместу адбіткаў пячатак, якія захаваліся ў фондзе 805 Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, дазволіў выявіць факт выкарыстання мясцовымі ўладамі пячатак з сімваламі дзяржаўных утварэнняў, якія на момант падпісання дакументаў зніклі і прызнаваліся ідэалагічна варожымі камуністам.

***Ключавыя словы:*** сфрагістыка; падзеі 1918–1919 гг. у Беларусі; дакументы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь; крыніцы па гісторыі Беларусі; дзяржаўна-палітычная сімволіка 1918–1919 гг.

# STATE AND POLITICAL SYMBOLS ON THE SEALS OF DOCUMENTS OF 1918–1919 (BASED ON MATERIALS FROM FUND 805 OF THE NATIONAL ARCHIVES OF THE REPUBLIC OF BELARUS)

***A. A. LUKASHOV*** [a]

[a] *Baranavichy State University, 21 Vojkava Street, Baranavičy 225404, Brest Region, Belarus*

Revolutionary events 1918–1919 on the territory of Belarus, the creation of the Belarusian statehood of newest history require comprehensive, including the sphragistical, research. In particular, a special study requires the role of this period in the formation of Soviet symbols. The process of creating the symbols of the world's first socialist states was reflected in the seals created and used during this period. An analysis of the content of the imprints of the seals in the 805 National Archive of the Republic of Belarus fund revealed the use of seals by local authorities with symbols of state formations that had disappeared at moment of use and were the ideological enemies of the Communists.

***Keywords:*** sphragistics; events of 1918–1919 in Belarus; National Archive of the Republic of Belarus documents; sources on the history of Belarus; state and political symbols of 1918–1919.

## Уводзіны

У Беларусі пытанні сфрагістыкі як спецыяльнай гістарычнай дысцыпліны ў дачыненні да айчыннай гісторыі распрацоўваліся А. К. Цітовым, С. Я. Расадзіным, М. Белямуком, І. Н. Колабавай, К. Р. Карпекіным, А. І. Шаландам і інш. Асноўную ўвагу даследчыкі надавалі вывучэнню пячатак перыяду Сярэдневякоўя і Новага часу. У прыватнасці, даследавалася паходжанне герба «Пагоня», а таксама іншых сімвалаў ВКЛ і яго частак [1–4]. Гэта натуральна, паколькі дадзеныя гістарычныя праблемы адносяцца да найбольш актуальных і слаба вывучаных.

Пытанням сфрагістыкі першай паловы XX ст., навейшай гісторыі ў цэлым надавалася значна менш увагі. У якасці прыкладу можна прывесці абагульняючую працу, прысвечаную сфрагістыцы Беларусі за ўвесь перыяд яе гісторыі, дзе пячаткам, якія ўжываліся ў першай палове XX ст., адводзілася ўсяго некалькі апошніх старонак кнігі [5]. Адзін з самых аўтарытэтных даследчыкаў беларускіх пячатак А. К. Цітоў прапанаваў наступную перыядызацыю помнікаў сфрагістыкі: старажытны перыяд (X–XIII стст.), велікакняжацкі перыяд (канец XIII – XVII ст.), перыяд позняй Рэчы Паспалітай (XVIII ст.), перыяд Расійскай імперыі (апошняя чвэрць XVIII ст. – 1917 г.). Распавядаючы пра апошні перыяд, аўтар у некалькіх радках згадвае 1917 г. як дату, з якой пачаўся «новы этап у беларускай сфрагістыцы, дзе галоўнымі перыядамі будуць даваенны і пасляваенны» [6, с. 11–18].

Пэўную цікавасць уяўляе нарыс А. М. Сідарэвіча, прысвечаны апісанню сімволікі пячаткі, якой была замацавана Першая Устаўная грамата БНР. Аўтар

адзначае малавядомы факт: сімвалам гэтай пячаткі была не «Пагоня», а выява касы і грабель, накладзеных на сноп каласоў [7].

Зусім нядаўна выйшла пяцітомная фундаментальная праца па гісторыі беларускай дзяржаўнасці [8]. У ёй прадстаўлены выявы пячатак з дзяржаўнымі гербамі ССРБ і Літбела.

Пытанні сфрагістыкі 1918–1919 гг. маюць вялікае значэнне для разумення гісторыі фарміравання дзяржаўных сімвалаў Беларусі навейшага часу, паколькі ва ўмовах рэвалюцыйных пераўтварэнняў важным носьбітам палітычнай сімволікі і сродкам ідэалагічнага процістаяння былі выявы на пячатках. Можна сказаць, што палітычная і ідэалагічная барацьба заўсёды суправаджаецца змаганнем сімвалаў. Роля выяў на пячатках стала яшчэ больш істотнай у сітуацыі, калі гаспадарка была разбурана ваеннымі дзеяннямі, а большая частка насельніцтва жыла ў галечы, што паўплывала на традыцыйныя сродкі ідэалагічнай прапаганды. Да таго ж умовы ваеннага часу патрабавалі рэгламентацыі перамяшчэння, спажывання і ўсяго ладу жыцця цывільнага насельніцтва, у сувязі з чым значна вырасла яго патрэба ў пропусках і іншых дакументах, якія выдавалі мясцовыя ўлады і на якіх змяшчаліся адбіткі пячатак.

## Вынікі і іх абмеркаванне

У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь (НАРБ) у фондзе 805 захоўваецца 12 спраў Мінскага раённага камісарыята харчавання Заходняй вобласці, пераўтворанага 5 студзеня 1919 г. у Камісарыят харчавання Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі. Гэта дзяржаўная ўстанова ва ўмовах харчовага крызісу была адной з найважнейшых структур бальшавіцкага ўрада. Увесь даследуемы перыяд дадзеную структуру ўзначальваў М. І. Калмановіч. Фонд 805 уключае дакументы 1918–1919 гг. агульным аб'ёмам 667 старонак. Сюды ўваходзяць паведамкі, інструкцыйныя лісты, цыркуляры, хадайніцтвы, пасведчанні, пропускі, рэзалюцыі, запыты, вопісы і інш. На многіх з іх стаяць адбіткі пячатак (матрыц пячатак). Сфрагістыка вывучае і самі матрыцы, але ў дадзеным даследаванні гаворка пойдзе толькі пра адбіткі, створаныя тушшу або чарніламі шляхам прыкладання матрыц да паперы. Паводле зместу выявы пячаткі можна падзяліць на літарныя і гербавыя (ці эмблемавыя, калі ўлічваць, што класічны герб павінен адпавядаць правілам геральдыкі). Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што частка сімвалаў на гэтых пячатках не была афіцыйна зацверджана ў якасці гербаў (ці эмблем). Усяго на дакументах фонду налічваецца 190 адбіткаў пячатак. На 113 з іх можна бачыць толькі тэкст, на астатніх 77 змешчаны сімвалы, якія і з'яўляюцца прадметам дадзенага даследавання. Аб'ект даследавання – дакументы фонду 805 НАРБ. Абсалютная большасць пячатак круглыя, толькі адна з іх мае трохвугольную і адна – шасцівугольную форму. Памер усіх адбіткаў гэтага фонду можна ацаніць як стандартны (круглыя пячаткі дыяметрам 3–5 см, пячаткі іншых форм – 3–5 см у вышыню і шырыню).

Большасць дакументаў створаны на пісчай паперы, часта ў клетку ці лінейку. У некаторых выпадках выкарыстана няякасная папера, падобная да абгортачнай. Часам ужыты спецыяльныя афіцыйныя бланкі, на якіх указана назва арганізацыі, з якой паходзіць дакумент, і яе прыналежнасць таму ці іншаму ведамству. Тэкст як легенды пячатак, так і саміх дакументаў напісаны на рускай мове ў адпаведнасці з правіламі дарэвалюцыйнай арфаграфіі. У тэксце многіх дакументаў сустракаюцца граматычныя памылкі. Ёсць яны і на адбітках пячатак. Для надпісаў на пячатках, у тым ліку і дэвіза камуністаў «Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!», характэрныя адвольныя скарачэнні. На тых дакументах, якія створаны не на спецыяльных бланках, а на простай пісчай паперы, стаяць штампы, змест якіх таксама ўяўляе цікавасць для сфрагістычных даследаванняў. На многіх дакументах прыводзяцца даты, але ні ў адным выпадку не ўдакладняецца, старому ці новаму стылю летазлічэння яны адпавядаюць. У шэрагу выпадкаў невысокая якасць адбіткаў перашкаджае чытанню дэталей.

Перыяд 1918–1919 гг. характарызуецца вострай палітычнай барацьбой, звязанай з сацыяльнымі і нацыянальнымі супярэчнасцямі. На тэрыторыі Беларусі ў гэты перыяд уладныя функцыі адначасова рэалізоўвалі некалькі дзяржаў, адбывалася замена капіталістычнай грамадска-эканамічнай фармацыі на сацыялістычную. І ўсё гэта адлюстроўвалася на дзяржаўна-палітычнай сімволіцы пячатак дадзенага перыяду, якія ставіліся на дакументы. Таму яе можна класіфікаваць паводле прыналежнасці да той ці іншай ідэалогіі: 1) сімволіка Расійскай імперыі; 2) сімволіка Часовага ўрада Расіі; 3) сімволіка савецкая, камуністычная (бальшавіцкая); 4) палітычна нейтральная. Да апошняй можна аднесці і сімвалы з малазразумелым значэннем.

Да першай групы належаць сем адбіткаў пячатак, на якіх выяўлены сімвалы царскай Расіі, ці, дакладней, гербы яе губерняў, – контур кароны над геральдычным шчытом «французскай» формы[1]. Усе яны, акрамя апошняга, даюць адбітак выварат-

[1]Пропуск // НАРБ. Ф. 805. Воп. 2. Спр. 4. Арк. 112 ; Пропуск // Там жа. Арк. 114 ; Пасведчанне // Там жа. Арк. 140 ; Пропуск // Там жа. Арк. 194 ; Пропуск // Там жа. Арк. 248 ; Пасведчанне // Там жа. Арк. 5 адв. ; Пасведчанне // Там жа. Воп. 1. Спр. 6. Арк. 1 адв.

кай. Выяву на геральдычным шчыце ні ў адным выпадку разгледзець немагчыма. Гэтыя сем адбіткаў, як можна па іх бачыць, належаць тром пячаткам: першыя пяць адбіткаў стаяць на пропусках, выдадзеных Выканаўчым камітэтам Савета рабочых дэпутатаў г. Барысава (аддзел харчавання) у лютым 1919 г.; шостая – Прусевіцкім валасным выканкамам Барысаўскага ўезда Мінскай губерні ў студзені 1919 г.; сёмая – Верхменскім выканкамам Ігуменскага ўезда Мінскай губерні. Такім чынам, пячаткі з царскай сімволікай выкарыстоўваліся і амаль праз два гады пасля звяржэння царскай улады і не ў самым аддаленым рэгіёне. Варта заўважыць, што на розныя дакументы разгледжанага фонду наклеена мноства паштовых марак, і фактычна ўсе яны з царскай сімволікай.

Да другой групы адносяцца тры адбіткі з дзяржаўнай сімволікай Часовага ўрада (двухгаловы арол без рэгалій)[2]. Гэта хадайніцтвы Цімкавіцкага валаснога зямельнага камітэта, якія датуюцца студзенем – лютым 1919 г. Яны належаць адной пячатцы, якая выкарыстоўвалася больш чым праз год і тры месяцы пасля звяржэння Часовага ўрада.

Большасць знойдзеных адбіткаў пячатак з трэцяй групы дакументаў змяшчаюць тыповую савецкую сімволіку, да якой адносяцца выявы прадметаў працы сялян і рабочых, прычым вылучаюцца выявы афіцыйна зацверджанай дзяржаўнай савецкай сімволікі, устойлівай з пункта гледжання зместу. Разам з тым яна характарызуецца пэўнай варыятыўнасцю, што было, верагодна, абумоўлена навізной гэтых сімвалаў і складанасцямі таго часу, выкліканымі рэвалюцыяй і інтэрвенцыяй. Да такой афіцыйна зацверджанай дзяржаўнай савецкай сімволікі адносіцца савецкі герб: серп і молат у абрамленні каласоў з надпісам: «Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!» Гэтыя элементы пазней ляглі ў аснову герба ў СССР і ўсіх савецкіх сацыялістычных рэспублік. Другой разнавіднасцю афіцыйна зацверджанай сімволікі з'яўляецца выява молата і плуга ў цэнтры пяціканцовай зоркі. Гэты сімвал быў зацверджаны Народным комісарыятам па ваенных справах РСФСР у маі 1918 г. у якасці знака ваеннаслужачых Чырвонай арміі. У хуткім часе адносна складаная выява плуга была заменена на больш простую выяву сярпа з тым жа сэнсам (сімвал сялянскай працы) і ў пазнейшыя часы часта называлася неафіцыйна малым гербам СССР.

Усяго ў справах Мінскага раённага камісарыята харчавання Заходняй вобласці знойдзена 17 адбіткаў савецкага герба, якія належаць 13 пячаткам. Розныя пячаткі заўважна адрозніваюцца прамалёўкай дэталей: відавочна, яны рабіліся майстрамі пячатак на аснове тэкставых апісанняў. На сямі з гэтых пячатак серп і молат змешчаны на картушы рознай формы, як гэта прынята ў класічнай геральдыцы. У астатніх нічога падобнага на картуш ці геральдычны шчыт заўважыць не ўдалося. Найбольш арыгінальным з выяўленых адбіткаў савецкіх пячатак трэба лічыць той, які змешчаны на адваротным баку пасведчання, выпісанага 14 красавіка 1919 г. Гомельскім павятовым харчовым камітэтам. Легенда адбітка гэтай пячаткі чытаецца не цалкам, але добра бачна, што на месцы дэвіза «Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!» размешчана абрэвіятура РСФСР[3]. Гэта адзіны прыклад, калі на месцы дэвіза камуністаў прыводзілася назва дзяржавы, што можа быць звязана з тым, што звычайна фраза з некалькіх слоў на адбітках усё роўна дрэнна чытаецца, таму, верагодна, вырашылі замяніць яе на кароткую абрэвіятуру. У некаторых выпадках каласы абапал сярпа і молата больш нагадваюць галінкі (але веданне сацыялістычнай сімволікі не дазваляе думаць, што гэта можа быць штосьці іншае, акрамя каласоў). З'яўленне такой выявы таксама можна патлумачыць цяжкасцю выразання на пячатках дробных дэталей. Яшчэ адзін унікальны варыянт савецкага герба змешчаны на пячатцы Стара-Талочынскага валаснога харчовага камітэта Савета сялянскіх, рабочых і чырвонаармейскіх дэпутатаў[4]. Унікальнасць гэтай выявы заключаецца ў тым, што ў яе верхняй частцы ў форме круга паказана сонца, а лініі, якія ад яго разыходзяцца, сімвалізуюць промні. Выява дадзенай пячаткі зроблена выпараткай (адзіная сярод выяў з савецкім гербам у фондзе). Варта адзначыць, што гербы СССР, РСФСР і БССР мелі выяву сонца, але яно падавалася ў выглядзе паўкруга і змяшчалася ў ніжняй частцы, а промні былі накіраваны ўверх. Яшчэ адным элементам герба СССР і БССР была пяціканцовая зорка, але на 13 пячатках з гэтай групы яна адсутнічае (на гербе РСФСР пяціканцовая зорка з'явілася толькі ў 1978 г.).

Змест некаторых дакументаў дазваляе зразумець працэс фарміравання сімволікі новастворанай ССРБ. У фондзе 805 НАРБ захоўваецца інструкцыйны ліст ад упраўляючага справамі Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада ў аддзел гарадскога харчовага забеспячэння. У гэтым лісце апісваецца выгляд, які павінна мець афіцыйная папера структур Урада ССРБ, у прыватнасці, прыводзіцца «форма печати для сведения и исполнения». На штампе ўказана дата атрымання: 10 студзеня 1919 г. У ніжнім левым кутку ад рукі алоўкам намаляваны схематычны эскіз пячаткі, на якім можна бачыць легенду па знешнім крузе: «Временное рабоче-крестьянское правительство Белоруссии»; легенду па ўнутраным крузе: «Комиссариат по… [неразборліва] делам». У цэнтры схематычнага эскіза пячаткі напісана:

[2]Хадайніцтва // Ф. 805. Воп. 2. Спр. 4. Арк. 95 ; Хадайніцтва // Там жа. Арк. 151 ; Хадайніцтва // Там жа. Арк. 264.
[3]Пасведчанне // Там жа. Арк. 127 адв.
[4]Пасведчанне // Там жа. Арк. 227.

«Здесь должен быть герб Советской России». З боку схемы машынапісным тэкстам дададзена: «Если здесь не делают герб, то оставить маленький пустой кружок»[5]. Гэта з'яўляецца сведчаннем таго, што герб ССРБ павінен быў цалкам паўтараць герб РСФСР і бальшавікі пры праектаванні першых гербаў не ставілі задачы паказаць адметнасць краіны і ўвогуле распрацоўвалі такую сімволіку выключна як ідэалагічную, а не як нацыянальную.

Да групы пячатак з сацыялістычнай сімволікай адносіцца выява пяціканцовай зоркі з плугам і молатам, змешчанымі ў крузе ў цэнтры. Як было зазначана вышэй, гэты сімвал узнік для абазначэння ўсяго, што звязана з Чырвонай арміяй. Характэрна, што ва ўсіх выпадках сама зорка ўпісана ў круг, а прастора паміж кругам і зоркай заштрыхавана. Можна меркаваць, што такім чынам падкрэсліваецца рознакаляровасць фону выявы і зоркі. Прамалёўка элементаў дадзенага сімвала ў параўнанні з савецкім дзяржаўным гербам значна больш аднастайная, у некаторых выпадках цяжка ўпэўнена казаць, колькім пячаткам належаць знойдзеныя адбіткі. Але гэтым падлікам у значнай ступені дапамагаюць легенды пячатак. Усяго ў фондзе знойдзена 38 такіх адбіткаў, якія належаць 9 пячаткам. З іх 24 адбіткі адносяцца да пячаткі з даволі вялікай легендай: «Главная комиссия попечения о беженцах» (па ўнутраным крузе); «Наркомвоендел. Центральная коллегия о пленных и беженцах» (па сярэднім крузе); «Российская Федеративная Советск. Республика» (па знешнім крузе). Такім чынам, назва дзяржавы на пячатцы аднаго з найважнейшых камісарыятаў напісана некарэктна (назва *Расійская Савецкая Федэратыўная Сацыялістычная Рэспубліка* была замацавана Канстытуцыяй РСФСР летам 1918 г., а большасць завераных дадзенай пячаткай дакументаў датуюцца 1919 г.). Яшчэ пяць пячатак, наколькі можна бачыць па адбітках, адрозніваюцца паміж сабой толькі легендай, а сімволіка на іх ідэнтычная ў дэталях. Гэта наводзіць на думку, што пячаткі ствараліся па нейкіх агульных лякалах. Можна меркаваць, што 30 адбіткаў належаць, як вынікае з надпісаў на іх саміх і на дакументах, якія імі завяраюцца, чатыром пячаткам і паходзяць з ваенных структур (Народны камісарыят па ваенных справах РСФСР, воінскія часці, камісарыяты), астатнія – з мясцовых саветаў (уздзенскі (2 адбіткі), валожынскі, Савет Верхменскай воласці Ігуменскага ўезда Мінскай губерні). Пячатка камандзіра 20-га стралковага палка вылучаецца тым, што адбітак з яе зроблены чарнілам зялёнага колеру (толькі адзіная пячатка ў падгрупе выканана вывараткай)[6]. Таксама гэта адзіны адбітак зялёнага колеру, які ўдалося знайсці ў фондзе 805 НАРБ, астатнія маюць спектр колераў ад пунсовых да карычневых і фіялетавых. Нешматлікімі з'яўляюцца адбіткі пячатак чорнага колеру. Праўда, 6 % усіх адбіткаў фонду даступныя даследчыкам толькі на чорна-белых мікрафішах, таму даведацца колер чарніла немагчыма. Арыгінальнай можна назваць пячатку Уздзенскага валаснога выканаўчага камітэта. На ёй змешчана выява сярпа і молата, накладзеных на сноп каласкоў. Промні зоркі намаляваны не прамымі лініямі, як на ваенных пячатках, а выпуклымі. На промнях зоркі прыводзіцца надпіс: «Р.С.Ф.С.Р.» – па адной літары на кожным промні. Дадзеная пячатка з'яўляецца яшчэ адным прыкладам неадпаведнасці паміж указанай на адбітку дзяржаўнай прыналежнасцю і датай дакумента, які яна завярае. Якасць вырабу пячаткі, у тым ліку дробных элементаў яе зместу, даволі высокая[7]. У архіве захоўваецца яшчэ адзін адбітак гэтай пячаткі[8].

У фондзе 805 НАРБ ёсць тры адбіткі пячатак трох выканаўчых камітэтаў саветаў на тэрыторыі Беларусі: свержаньскага (Мінскі павет), гарадзейскага (Навагрудскі павет Мінскай губерні) і маладзечненскага (Віленская губерня)[9]. Дакументы, на якіх стаяць гэтыя пячаткі, датуюцца студзенем – лютым 1919 г. На ўсіх трох дакументах адлюстраваны накладзеныя адзін на аднаго серп, граблі і каса – прылады сялянскай працы. Сімвалы гэтых пячатак вельмі падобныя да тых, што змешчаны на пячатцы на Першай Устаўнай грамаце БНР, з той толькі розніцай, што тут замест снапа каласоў прыводзіцца выява сярпа. Гэта наводзіць на думку, што сімвалы шэрагу выканаўчых камітэтаў саветаў на тэрыторыі Беларусі і сімвалы БНР на пачатку яе існавання выяўлялі адны і тыя ж ідэі, а распаўсюджанае ў савецкай і часткова сучаснай беларускай гістарыяграфіі супрацьпастаўленне БНР і БССР з'яўляецца неабгрунтаваным спрашчэннем (гл. малюнак).

На пячатцы з легендай: «Союз рабочей кооперации Западного района. Минское отделение» – можна бачыць два перакрыжаваныя малаткі, відавочна, гэта сімвал працоўных. Дадзеная пячатка прадстаўлена ў фондзе 805 НАРБ чатырма адбіткамі, датаванымі лютым 1919 г.[10] У цэлым сукупнасць гэтых сямі адбіткаў, якія належаць чатыром пячаткам, можа быць вылучана ў пэўную падгрупу пячатак нізавых саветаў з сацыялістычнай сімволікай.

---

[5] Інструкцыйны ліст // НАРБ. Ф. 805. Воп. 1. Спр. 3. Арк. 24.
[6] Хадайніцтва // Там жа. Воп. 2. Спр. 4. Арк. 164.
[7] Хадайніцтва // Там жа. Арк. 129.
[8] Пасведчанне // Там жа. Арк. 298.
[9] Хадайніцтва // Там жа. Арк. 171 ; Рэзалюцыя // Там жа. Арк. 242 ; Пасведчанне // Там жа. Арк. 58 адв.
[10] Хадайніцтва // Там жа. Арк. 206 ; Хадайніцтва // Там жа. Арк. 207 ; Хадайніцтва // Там жа. Арк. 208 ; Хадайніцтва // Там жа. Арк. 262.

*а*/*a* *б*/*b*




Сімвалы пячатак Народнага сакратарыята Беларусі
на Першай Устаўнай грамаце БНР (люты 1918 г.) (*а*)
і Сверменскага валаснога выканаўчага камітэта Мінскай губерні
і Мінскага павета (люты 1919 г.) (*б*)
Symbols of the Seals of the People's secretariat of Belarus on the First statutory charter
of the Belarusian People's Republic (February 1918) (*a*) and the Svieržań Volasć Executive Committee
of the Minsk Gubernia and Minsk Uezd (February 1919) (*b*)

Да чацвёртай групы (палітычна нейтральная сімволіка) можна аднесці 8 адбіткаў пячатак з выявай прамога сіметрычнага крыжыка на дакументах, якія паходзяць з Камісарыята аховы здароўя РСФСР. Можна ўпэўнена сцвярджаць, што гэта сімвал Міжнароднага камітэта Чырвонага Крыжа[11]. На двух іншых дакументах стаяць адбіткі пячатак з адносна простым знакам у выглядзе завіткоў (такіх сімвалаў аўтар даследавання ніколі раней не бачыў). Першы з гэтых адбіткаў мае легенду: «Мінскі раённы харчовы камісарыят» (па крузе) і «Аддзел харчавання» (у цэнтры). Другая пячатка шасцігранная, яна мае легенду: «Мінскі губ. камісарыят міліцыі», дакумент з яе адбіткам датуецца студзенем 1919 г. Верагодна, згаданыя завіткі выконваюць простую функцыю ўпрыгожвання[12].

Маюцца таксама няякасныя адбіткі пячатак, на якіх немагчыма ідэнтыфікаваць сімвалы[13].

## Высновы

Такім чынам, даследаванне далёка не самага аб'ёмістага фонду і не самай важнай структуры бальшавіцкага ўрада дазволіла знайсці сімволіку ўсіх асноўных дзяржаўных утварэнняў і палітычных структур рэвалюцыйнага часу (1917–1919) на неакупаванай Германіяй ці Польшчай частцы тэрыторыі Беларусі. Імклівае змяненне сітуацыі і сацыяльна-эканамічныя ўмовы, выкліканыя вайной і рэвалюцыяй, вялі да таго, што пячаткі з пэўнай дзяржаўна-палітычнай сімволікай працягвалі выкарыстоўвацца і пасля знікнення таго дзяржаўна-палітычнага ўтварэння, з якім яны былі звязаны. Можна нават казаць пра пэўны часавы лаг паміж датай узнікнення дзяржавы і з'яўленнем пячатак з яе сімволікай. Гэта было звычайнай устойлівай з'явай. Камуністычная ідэалогія, якой прытрымліваліся прыхільнікі бальшавікоў, акцэнтавала ўвагу на агульнакласавых інтарэсах рабочых і сялян усяго свету, што знайшло ўвасабленне ў яе сімвалах, цэнтральнае месца сярод якіх займалі сродкі працы. У выніку сімвалы РСФСР і ССРБ змястоўна мала адрозніваліся адзін ад аднаго ці поўнасцю супадалі. Адбіткаў пячатак Літбела ў даследаваным архіве не знойдзена. На той момант бальшавікі не бачылі праблемы ў аднастайнасці гербаў першых сацыялістычных дзяржаў і нават выдавалі інструкцыі, у якіх змяшчаліся прамыя ўказанні па стварэнні гербаў новых дзяржаў (у нашым выпадку – ССРБ) на аснове пэўнага ўзору. Тым не менш і ў такіх умовах можна бачыць варыятыўнасць у прамалёўцы дэталей савецкіх гербаў, што тлумачыцца праяўленнем творчасці мясцовых улад у справе распрацоўкі сімволікі, якая выкарыстоўвалася на пячатках.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Шаланда АІ, складальнік. Метадычныя рэкамендацыі па апісанні сфрагістычных матэрыялаў XV–XVIII стст. у архівах Беларусі. Мінск: БелНДІДАС; 2015. 48 с.
2. Шаланда АІ. Сімвалы і гербы зямель Беларусі ў X–XVIII стст.: геральдычна-сфрагістычныя нарысы. 2-е выданне. Мінск: Беларуская навука; 2013. 182 с.

[11]Хадайніцтва // Ф. 805. Воп. 2. Спр. 4. Арк. 25.
[12]Хадайніцтва // Там жа. Арк. 234 ; Рэзалюцыя // Там жа. Воп. 1. Спр. 3. Арк. 38.
[13]Пасведчанне // Там жа. Воп. 2. Спр. 4. Арк. 200 ; Вопіс // Там жа. Воп. 1. Спр. 6. Арк. 20.

3. Белямук М. Вытокі беларускіх пячаткаў. Cleveland: [s. n.]; 1986. 47 с.
4. Колабава ІН. Сфрагістычная калекцыя Віленскага музея старажытнасцей. У: Бондар ЮП, рэдактар. Пятыя Міжнародныя Тышкевіцкія чытанні. Матэрыялы Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі; 14–15 мая 2014 г.; Мінск, Беларусь. Мінск: Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў; 2015. с. 114–125.
5. Цітоў АК. Сфрагістыка і геральдыка Беларусі. Мінск: Метадычна-выдавецкі цэнтр РІВШ БДУ; 1999. 175 с.
6. Цітоў АК. Метадычныя парады па апісанні помнікаў сфрагістыкі для архіваў і музеяў. Мінск: Метадычна-выдавецкі цэнтр РІВШ БДУ; 1997. 44 с.
7. Сідарэвіч АМ. Першы сімвал новай Беларусі: якім гербам была замацавана Першая Устаўная грамата БНР. *Наша ніва.* 2015, 18 лістапада. с. 1.
8. Коваленя АА, редактор. *История белорусской государственности. Том 3. Белорусская государственность: от идеи к национальному государству (1917–1939 гг.).* Минск: Беларуская навука; 2019. 639 с.

## References

1. Shalanda AI, compiler. *Metadychnyja rjekamendacyi pa apisanni sfragistychnyh matjeryjalaw XV–XVIII stst. u arhivah Belarusi* [Methodical recommendations for the description of sphragistic materials of the 15th–18th centuries in the archives of Belarus]. Minsk: Belarusian Research Institute for Documentation Science and Archival Affairs; 2015. 48 p. Belarusian.
2. Shalanda AI. *Simvaly i gerby zjamel' Belarusi w X–XVIII stst.: geral'dychna-sfragistychnyja narysy* [Symbols and coats of arms of the lands of Belarus in the 10th–18th centuries: heraldic-sphragistic essays]. 2nd edition. Minsk: Belaruskaja navuka; 2013. 182 p. Belarusian.
3. Belyamuk M. *Vytoki belaruskih pjachatkaw* [The origins of the Belarusian seals]. Cleveland: [s. n.]; 1986. 47 p. Belarusian.
4. Kolabova IN. [Sphragistic collection of the Vilnius museum of antiquities]. In: Bondar YuP, editor. *Pjatyja Mizhnarodnyja Tyshkevickija chytanni. Matjeryjaly Mizhnarodnaj navukova-praktychnaj kanferjencyi; 14–15 maja 2014 g.; Minsk, Belarus'* [Fifth International Tyszkiewicz readings. Proceedings of the International scientific-practical conference; 2014 May 14–15; Minsk, Belarus]. Minsk: Belarusian State University of Culture and Arts; 2015. p. 114–125. Belarusian.
5. Titov AK. *Sfragistyka i geral'dyka Belarusi* [Sphragistics and heraldry of Belarus]. Minsk: Methodical and publishing center of the Republican Institute for Higher Education, Belarusian State University; 1999. 175 p. Belarusian.
6. Titov AK. [Methodical advice on the description of sphragistic monuments for archives and museums]. Minsk: Methodical and publishing center of the Republican Institute for Higher Education, Belarusian State University; 1997. 44 p. Belarusian.
7. Sidarevich AM. [The first symbol of the new Belarus: what emblem was attached to the First charter of the Belarusian People's Republic]. *Nasha niva*. 2015 November 18. p. 1.
8. Kovalenya AA, editor. *Istoriya belorusskoi gosudarstvennosti. Tom 3. Belorusskaya gosudarstvennost': ot idei k natsional'nomu gosudarstvu (1917–1939 gg.)* [History of the Belarusian statehood. Volume 3. Belarusian statehood: from the idea to the national state (1917–1939)]. Minsk: Belaruskaja navuka; 2019. 639 p. Russian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 13.02.2021.*
*Received by editorial board 13.02.2021.*